# ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР-86: ЯГО ДАСЯГНЕННІ

* * *

*Удастоены ўрадавых узнагарод*

## ВЯРШЫНЬ ДАСЯГАЮЦЬ НАСТОЙЛІВЫЯ

Праляцела непрыкметна яшчэ адно працоўнае лета. Для Аляксандра Дразда яно было сёмым! Што і казаць, багатая будаатрадаўская біяграфія ў юнака. Ёсць яму што нагадаць, успомніць. Кожнае лета, праведзенае ў будатрадзе, памятнае для яго. А сёлетняе — асабліва, таму што яго ўдзел у патрыятычным руху высока ацэнены Радзімай. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за высокія вытворчыя паказчыкі, дасягнутыя ў адзінаццатай пяцігодцы ў саставе студэнцкіх атрадаў, і поспехі ў вучобе, грамадскай рабоце ён узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць».

Таму невыпадкова яму, чацвёртакурсніку гісторыка-філалагічнага факультэта Аляксандру Дразду, было прадстаўлена права выступіць у мінулы панядзелак на ўрачыстым пасвячэнні першакурснікаў у студэнты, перадаць ім эстафету слаўных працоўных традыцый Гомельскага дзяржуніверсітэта. Гэтага гонару ўдастойваюцца лепшыя з лепшых будатрадаўцаў ГДУ.

Ёсць такія мудрыя словы: «Вяршыні скараюцца тым, хто не баіцца цяжкасцей». Ніколі не шукаў лёгкіх сцяжынак і Аляксандр. Заўсёды знаходзіўся там, дзе былі патрэбны працавітыя, на ўсё здатныя рукі, неспакойныя маладыя сэрцы. Не вагаўся доўга, калі стаяў перад выбарам: заставацца на працоўнае лета-84 ў роднай Беларусі, ці паехаць туды, дзе здарылася бяда — землетрасенне. Выбраў другое, і разам з байцамі атрада «Гомель» паехаў у далёкую Бухарскую вобласць на аднаўленне горада Газлі.

За сем гадоў знаходжання ў СБА Аляксандр прайшоў шлях ад радавога байца да камандзіра занальнага штаба. Мінулым летам быў галоўным інжынерам Рэчыцкага, а сёлета — камандзірам Жлобінскага занальнага штабаў. На тэрыторыі трох раёнаў — Рагачоўскага, Акцябрскага, Жлобінскага дыслацыраваліся 35 студэнцкіх атрадаў. Няцяжка ўявіць, якой самаадданасцю павінен валодаць камандзір такой вялікай сваёй «гаспадаркі»: каб усюды справы ішлі належным чынам, кожная гадзіна Аляксандра была распісана па мінутах, запоўнена да адказу. Усё — дзеля справы — такі дэвіз Аляксандра.



Па будатрадаўскаму стажу А. Дрозд, як кажуць, ветэран. Калі паспеў толькі набыць такі? Справа ў тым, што юнак ужо закончыў да гэтага Гомельскае педагагічнае вучылішча. Яшчэ там пачаў сваю працоўную біяграфію ўдзельніка СБА. На яго форменнай куртцы шмат адзнак працоўных семестраў — значкі, шэўроны, паглядзеўшы на якія кожны, хто не ведае асабіста Аляксандра, адзначыць пра сябе: «Вопытны ў будатрадаўскай справе чалавек!». А ў вачах яго гарацць гарэзлівыя агеньчыкі, твар свеціцца ўсмешкай, як у хлапчука. Так, сталасць, жыццёвы вопыт прыходзіць і да маладых людзей, хто ўсю сваю душу аддае любімай справе.

...Хутка будзе знята і старанна складзена ў шафе зялёная куртка будатрадаўца. Да наступнага лета развітаецца з ёю Аляксандр. А пакуль у яго яшчэ ёсць неадкладныя справы ў Жлобінскім занальным штабе. Калі пачнуцца заняткі пасля вяртання студэнтаў з сельгасработ, і ў маладога камуніста А. Дразда будзе працягвацца студэнцкае жыццё, запоўненае вучобай і шматлікімі грамадскімі абавязкамі, да якіх ён адносіцца як і да будатрадаўскіх спраў з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Ён — камандзір аператыўнага камсамольскага атрада дружыннікаў універсітэта, член камітэта камсамола ГДУ, член Цэнтральнага РК ЛКСМБ г. Гомеля.

Узнагарода Радзімы — гэта не толькі прызнанне вялікіх заслуг. Яна абавязвае: не спыняйся на дасягнутым, заваёўвай новыя вяршыні.

У Аляксандра Дразда такія вяршыні яшчэ будуць!

**Т. ДУБЯК.**
Фота **Н. Кір'янавай.**

*Новы адрас атрада*

## «СНЯЖЫНКА»

Нікога не здзівіш цяпер тым, што студэнтаў у час летняга працоўнага семестра можна сустрэць усюды: на будаўнічых аб'ектах, на калгасных палетках, у вагонах паяздоў, на борце самалёта, у бальніцах, дзіцячых дамах... Пералік гэты, безумоўна, няпоўны, таму што з кожным годам усё новыя і новыя месцы прыкладання сваім працавітым рукам знаходзіць студэнцкая моладзь.

Сёлета ва універсітэце ўзнік атрад новага напрамку: для работы ў Гомельскім абласным вытворчым аб'яднанні хімчысткі і пральных «Сняжынка». У яго ўвайшлі дзяўчаты пачатковых курсаў эканамічнага факультэта.

Калі я і некаторыя мае сяброўкі даведаліся аб гэтым, таксама пажадалі стаць байцамі такога атрада. Для мяне асабіста гэта быў першы працоўны семестр у маім студэнцкім жыцці. І няхай не давялося зведаць рамантыку далёкіх дарог, бо працавала ў г. Гомелі, усё роўна спазнала радасць, задавальненне ад таго, што ўнесла часцінку сваёй працы ў агульную справу.

Працавалі мы, 16 байцоў «Альтаіра», камандзірам якога была Аня Смольская, камісарам — Ала Гаўрыленка, у механічнай пральні № 4, дзве дзяўчыны — у пральні № 2. Работа наша, на першы погляд, можа здацца вельмі ўжо празаічнай, будзённай. Ну, што скажуць некаторыя, цікавага ў тым, што прасуеш бялізну? Мы ж так не думалі. Ведалі: тут, асабліва ў летні час, не хапае рабочых рук. Разумелі, што на нас спадзяюцца работнікі аб'яднання.

За змену нам трэба было апрацаваць на прасавальных прэсах звыш тоны памытай бялізны. Стараліся план выконваць. Праўда, не заўсёды ўсё залежыла толькі ад нас. Здараліся перабоі ў забеспячэнні пральні парай, электраэнергіяй. Гэта, канешне, выбівала нас з рабочага рытму, псавала настрой.

Памятным для нашага атрада стаў дзень 10 жніўня, калі на цэнтральным стадыёне вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш», а затым у парку культуры і адпачынку імя Луначарскага праходзіў фестываль студэнцкіх атрадаў. З 16 яго ўдзельнікаў наш «Альтаір» быў прызнаны лепшым сярод СА небудаўнічага напрамку. Гэты поспех не прыйшоў сам па сабе. Яго мы, байцы «Альтаіра», заваёўвалі ўсе разам сваёй стараннай працай непасрэдна на нашым месцы «дыслакацыі», перамогамі ў разнастайных спаборніцтвах і конкурсах фестывалю.

Закончылася працоўнае лета. Мы зноў сустрэліся са сваімі аднакурснікамі, старэйшымі сяброўкамі, якія вярнуліся ва універсітэт з іншых студэнцкіх атрадаў. Дзяліліся ўражаннямі, абменьваліся думкамі. І мы, байцы атрада «Альтаір», яшчэ раз пераканаліся ў тым, што ўсё ў канчатковым выніку залежыць не ад месца працы атрада, а ад добрасумленнасці, стараннасці кожнага яго байца.

**Валянціна ЮНІЦКАЯ,**
**студэнтка гр. 0-21 эканамічнага факультэта, баец атрада «Альтаір».**



Байцы атрада «Ветразь» працавалі гэтым летам на Гомельскім шклозаводзе імя Ламаносава. Студэнтцы 3-га курса фізічнага факультэта Людміле Місевай (на здымку) быў даручаны працэс мыцця шкла.

Фота **Н. Кір'янавай.**

***У абласным аграпрамысловым камітэце, абкоме ЛКСМБ і аблсаўпрофе***

## АБ ПРАВЯДЗЕННІ АБЛАСНОГА АГЛЯДУ

### СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ І ЛЬНУ, АГАРОДНІНЫ І САДАВІНЫ Ў 1986 ГОДЗЕ

Надаючы вялікае значэнне ролі студэнцкіх атрадаў у выкананні Харчовай праграмы краіны, а таксама ўзмацненню грамадска-палітычнай работы студэнцкай і навучэнцкай моладзі ў калгасах і саўгасах, калегія абласнога аграпрамысловага камітэта, бюро абкома ЛКСМБ, прэзідыум аблсаўпрофа прынялі пастанову, у якой прадугледжана ў верасні — кастрычніку 1986 года правесці абласны агляд студэнцкіх атрадаў, якія заняты на ўборцы бульбы, ільну, агародніны і садавіны. Зацверджаны ўмовы абласнога агляду, устаноўлены грашовыя прэміі пераможцам.

Раённым аграпрамысловым аб'яднанням, гаркомам, райкомам камсамола, райкомам прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу даручана правесці раённыя агляды студэнцкіх атрадаў, якія працуюць на ўборцы бульбы, ільну, агародніны і садавіны восенню 1986 года.

## УМОВЫ

### АБЛАСНОГА АГЛЯДУ СТУДЭНЦКІХ АТРАДАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НА ЎБОРЦЫ БУЛЬБЫ І ЛЬНУ, АГАРОДНІНЫ І САДАВІНЫ ВОСЕННЮ 1986 ГОДА

У абласным аглядзе прымаюць удзел студэнцкія атрады, якія працуюць у калгасах і саўгасах вобласці.

Пераможцамі будуць прызнаны студэнцкія атрады, якія даб'юцца лепшых вынікаў у павышэнні прадукцыйнасці працы, арганізацыі ўнутрыатраднай дысцыпліны, павышэнні якасці выконваемых работ, скарачэнні ўстаноўленых тэрмінаў уборкі ўраджаю, арганізацыі грамадска-палітычнай і ідэйна-выхаваўчай работы ў месцах знаходжання.

Атрады, у якіх будуць дапушчаны парушэнні правіл тэхнікі бяспекі, унутрыатраднай дысцыпліны, невыкананне норм выпрацоўкі, і атрады, якія не працуюць на ўборцы бульбы, ільну, агародніны і садавіны, у аглядзе не ўдзельнічаюць.

Пераможцы абласнога агляду будуць узнагароджаны:

**за першае месца** — адзін атрад ад вышэйшых і адзін атрад ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 1500 рублёў;

**за другое месца** — адзін атрад ад вышэйшых і адзін атрад ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 1000 рублёў;

**за трэцяе месца** — адзін атрад ад вышэйшых і два атрады ад сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў Ганаровай граматай АК ЛКСМБ і грашовай прэміяй у суме 700 рублёў.

## ПАДАРОЖЖА «ЭЛЕКТРОНІКІ»

Ларысе Сініла, Наталлі Кухаравай, Людміле Калтуновай і іншым студэнтам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, дарэчы, — будучым спецыялістам у галіне праграміравання і вылічальнай тэхнікі — гэта лета запомніцца надоўга. Чаму? У складзе спецыяльна арганізаванага атрада яны абслугоўвалі ПКАК, які створаны для таго, каб як мага больш людзей не толькі ўбачылі сапраўдную ЭВМ «Электроніка-60», але і маглі з ёй папрацаваць. А перад гэтым студэнты цікава расказваюць аб гісторыі стварэння электронных машын, этапах іх развіцця, прымяненні ў сучаснай вытворчасці і перспектывах.

Школьнікі піянерскіх лагераў з цікавасцю слухалі выступаючых і смела ішлі на кантакт з вылічальнай машынай, бо ў рабоце з дзецьмі выкарыстоўваліся элементы гульні. І радасці было нямала, калі выйгравалі хлопчыкі і дзяўчынкі.

Але былі і складанасці, хоць мы і рыхтаваліся да іх. Цяжка было загадзя прадугледзець, з якой аўдыторыяй давядзецца працаваць. Таму прыходзілася, што называецца, перастройвацца на хаду. Пакуль, пэўна, рана падводзіць вынікі. Адзінае, што можна сказаць: справа, якую распачалі, вельмі патрэбная. А ў наступным годзе абком камсамола мяркуе разгарнуць яе больш шырока.

**У. КАРАКА,**
**старшы навуковы супрацоўнік ГДУ, кіраўнік перасоўнага камп'ютэрнага агіткомплексу.**

## ПРАЦАВАЦЬ СТАРАННА, ПА-УДАРНАМУ

**На гэтым тыдні па даўняй традыцыі летні працоўны семестр перадаў эстафету асенняму. Студэнты на чале з выкладчыкамі выехалі на дапамогу сельскім працаўнікам. Яны будуць працаваць у 23 гаспадарках Петрыкаўскага, Жыткавіцкага, Чачэрскага і Гомельскага раёнаў, а таксама на Жлобінскім і Буда-Кашалёўскім ільнозаводах. 45 чалавек выдзелена для Гомельскай кандытарскай фабрыкі «Спартак».**

**Гонар усіх пасланцоў універсітэта — прадэманстраваць на сельскагаспадарчай вытворчасці ўзоры працалюбства і стараннасці, каб заняць высокае месца ў абласным аглядзе студэнцкіх атрадаў.**




# ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАМ УСЕСАЮЗНАГА СІМПОЗІУМА ПА ТЭОРЫІ ГРУП

**9—11 ВЕРАСНЯ У ГОМЕЛІ БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ X УСЕСАЮЗНЫ СІМПОЗІУМ ПА ТЭОРЫІ ГРУП. ЁН ПРАВОДЗІЦЦА ІНСТЫТУТАМ МАТЭМАТЫКІ АН БССР, ЯГО ГОМЕЛЬСКІМ АДДЗЯЛЕННЕМ І ГОМЕЛЬСКІМ ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТАМ. У РАБОЦЕ СІМПОЗІУМА ПРЫМЕ ЎДЗЕЛ КАЛЯ 200 САВЕЦКІХ АЛГЕБРАІСТАЎ. СЯРОД ІХ — БОЛЬШ 30 ДАКТАРОЎ ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК.**

**АРГКАМІТЭТ СІМПОЗІУМА ЎЗНАЧАЛЬВАЕ ЛАЎРЭАТ ЛЕНІНСКАЙ ПРЭМІІ АКАДЭМІК АН БССР ДЫРЭКТАР ІНСТЫТУТА МАТЭМАТЫКІ АН БССР У. П. ПЛАТОНАЎ.**

**Па даўно ўстанавіўшайся традыцыі Усесаюзныя алгебраічныя калёквіумы праходзяць у тых гарадах, дзе склаліся алгебраічныя школы. Гомельская алгебраічная школа тэорыі груп, створаная і ўзначальваемая Сяргеем Антонавічам Чуніхіным, шырока вядома сярод алгебраістаў як у Савецкім Саюзе, так і за рубяжом. Таму заканамерна, што Гомель выбран месцам правядзення IX Усесаюзнага алгебраічнага калёквіума. Той факт, што тут мы сабраліся для работы, яшчэ раз пацвярджае вялікі аўтарытэт Гомельскай алгебраічнай школы.**

**М. І. КАРГАПОЛАЎ,
член-карэспандэнт АН СССР.**

(З выступлення пры адкрыцці IX Усесаюзнага алгебраічнага калёквіума).

## 1968 ГОД: НА IX УСЕСАЮЗНЫМ АЛГЕБРАІЧНЫМ КАЛЁКВІУМЕ

IX Усесаюзны алгебраічны калёквіум праходзіў у Гомелі ў пачатку ліпеня 1968 года. У яго рабоце ўдзельнічала 295 алгебраістаў з 50 гарадоў Савецкага Саюза. Сярод іх было 17 дактароў і 130 кандыдатаў навук, а таксама 19 студэнтаў і адзін школьнік. Найбольш прадстаўнічымі з'яўляліся дэлегацыі з Масквы, Новасібірска, Свярдлоўска, Ленінграда, Кішынёва, Кіева і Мінска.

Упершыню па прапанове старшыні аргкамітэта акадэміка АН БССР С. А. Чуніхіна пачалі стварацца саветы секцый. Працавалі секцыі канечных груп; паўгруп, квазігруп і іншых абагульненняў груп; агульнай тэорыі груп; кольцаў, алгебр, модуляў, структур, катэгорый; логікі, аўтаматаў, графаў.

Адно з пленарных пасяджэнняў калёквіума прысвячалася памяці выдатнага савецкага алгебраіста лаўрэата Ленінскай прэміі акадэміка А. І. Мальцава. З дакладам аб яго жыцці і дзейнасці выступіў член-карэспандэнт АН СССР М. І. Каргаполаў. Свае выступленні прысвяцілі буйнаму вучонаму таксама С. І. Адзян, С. М. Чэрнікаў, Б. І. Плоткін, Ш. С. Кемхадзе, Я. М. Кузьмін.

Калёквіум падтрымаў прапанову аб адкрыцці ў Гомелі другога ў Беларусі дзяржаўнага універсітэта.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады С. І. Адзяна і П. С. Новікава (Масква), В. Д. Белавусава (Кішынёў), В. М. Глушкова, А. А. Лецічэўскага, С. М. Чэрнікава (Кіеў), М. І. Каргаполава, Я. М. Кузьміна, В. Д. Мазурава (Новасібірск), Я. С. Ляпіна (Ленінград), Л. М. Глускіна (Харкаў), Г. С. Маканіна (Масква), А. Д. Тайманава (Алма-Ата), Б. І. Плоткіна (Рыга). Навуковыя працы большасці з названых аўтараў увайшлі ў залаты фонд сусветнай алгебраічнай навукі.



**НА ЗДЫМКУ: заснавальнік гомельскай алгебраічнай школы акадэмік АН БССР С. А. Чуніхін у перапынку работы калёквіума, які праходзіў у Гомелі ў 1968 годзе, гутарыць з прафесарам С. П. Азлецкім (г. Свярдлоўск).**



**У зале, дзе праходзіў калёквіум алгебраістаў, з вялікай увагай былі праслуханы ўсе даклады. На пярэднім плане (злева направа): У. П. Платонаў, М. І. Каргаполаў і А. І. Шыршоў.**

## 1975 ГОД: НА XIII УСЕСАЮЗНЫМ АЛГЕБРАІЧНЫМ КАЛЁКВІУМЕ

Адзінаццаць гадоў таму назад горад над Сожам зноў стаў месцам сустрэчы вядучых алгебраістаў краіны. На гэты раз ён быў яшчэ больш прадстаўнічым. Абмяняцца думкамі сабралася 33 доктары і 149 кандыдатаў навук з 64 гарадоў СССР.

Да адкрыцця XIII Усесаюзнага калёквіума былі выдадзены тэзісы дакладаў яго ўдзельнікаў. Пасля пленарных пасяджэнняў працавала 5 секцый.

На пленарных пасяджэннях былі заслуханы даклады: С. А. Чуніхіна, Л. А. Шамяткова (Гомель), У. П. Платонава, У. С. Конюха, А. Я. Залескага, В. І. Сярожкіна (Мінск), Д. К. Фадзеева (Ленінград), С. М. Чэрнікава, А. У. Ройцэра (Кіеў), В. П. Елізарава, А. А. Нячаева (Масква), В. Д. Белавусава, Ю. М. Рабухіна (Кішынёў), В. Д. Мазурава, У. М. Рамесленікава, М. С. Раманоўскага, І. П. Шастакова, С. С. Ганчарова (Новасібірск), Ю. М. Мухіна (Свярдлоўск).

На заключным пасяджэнні калёквіума адзначалася, што заслуханыя даклады сведчаць аб прыкметных дасягненнях савецкай алгебраічнай навукі за апошнія гады.



**30 чэрвеня 1975 года на пленарным пасяджэнні з дакладам выступаў член-карэспандэнт АН СССР Д. К. Фадзееў (Ленінград). У яго адрас было шмат апладысментаў. У дакладзе вучонага былі адлюстраваны буйныя навуковыя вынікі. А яшчэ яго павіншавалі з днём нараджэння.**

**НА ЗДЫМКУ: член-карэспандэнт АН СССР Д. К. Фадзееў (злева) і акадэмік АН БССР Д. А. Супруненка.**



**У 1975 годзе на XIII Усесаюзным алгебраічным калёквіуме вельмі плённа працавала секцыя тэорыі канечных груп. Кожнае паведамленне выклікала павышаную цікавасць, аб чым можна меркаваць па гэтаму здымку.**

**На пярэднім плане дактары фізіка-матэматычных навук Л. А. Шамяткоў (Гомель) і В. Д. Мазураў (Новасібірск).**



**У час работы калёквіума шмат аб чым было пагутарыць дактарам фізіка-матэматычных навук (злева направа А. У. Ройцэру, Л. А. Назаравай і З. І. Барэвічу.**

## 1986 ГОД: ПА ПРАГРАМЕ СІМПОЗІУМА

У састаў аргкамітэта X сімпозіума па тэорыі груп ўвайшлі: акадэмік АН БССР У. П. Платонаў (старшыня), член-карэспандэнт АН СССР А. І. Кастрыкін (Масква), член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў (Гомель) — намеснікі старшыні, к. ф.-м. н. В. С. Манахаў (Гомель), вучоны сакратар, д. ф.-м. н. С. І. Адзян (Масква), д. ф.-м. н. З. І. Барэвіч (Ленінград), член-карэспандэнт АН СССР Ю. Л. Яршоў (Новасібірск), д. ф.-м. н. А. Я. Залескі (Мінск), д. ф.-м. н. А. Ю. Альшанскі (Масква), д. ф.-м. н. У. Н. Рамесленікаў (Омск), д. ф.-м. н. А. В. Раманоўскі (Гомель), д. ф.-м. н. А. І. Старасцін (Свярдлоўск), акадэмік АН БССР Д. А. Супруненка (Мінск), член-карэспандэнт АН СССР Д. К. Фадзееў (Ленінград), член-карэспандэнт АН УССР С. М. Чэрнікаў (Кіеў).

На пленарным пасяджэнні будуць заслуханы даклады У. Л. Папова (Масква) «Групы аўтамарфізмаў алгебр мнагачленаў», А. Г. Мяснікова, У. М. Рамесленікава (Омск) — «Тэарэтыка-мадэльныя пытанні тэорыі груп», А. Я. Залескага (Мінск) — «Уласныя значэнні матрыц канечных лінейных груп і тэорыя прадстаўленняў», У. П. Платонава (Мінск) — «Кольцы і мнагаабраззі прадстаўленняў канчаткова пароджаных груп», Ю. В. Кузьміна (Масква) — «Некаторыя пытанні гамалагічнай тэорыі груп», Я. І. Хухро (Новасібірск) — «Нільпатэнтныя p-групы, блізкія да груп простага перыяду», М. Л. Гардзеева (Ленінград) — «Якасная тэорыя інварыянтаў канечных груп», Д. П. Жалабенкі (Масква) — «Сучасны стан тэорыі прадстаўленняў рэдуктыўных груп», Л. А. Шамяткова (Гомель) — «Новыя ідэі і вынікі тэорыі фармацый», У. І. Чарнавусава (Мінск) — «Аб будове груп рацыянальных кропак анізатропных алгебраічных груп над глабальнымі палямі», Ю. М. Мухіна (Свярдлоўск) — «Падгрупавыя характарызацыі тапалагічных груп», В. А. Усціменкі (Кіеў) — «Групы, квазігрупы і геаметрыі Цітса».

Пасля пленарных пасяджэнняў будуць працаваць секцыі агульнай тэорыі груп, канечных груп, лінейных груп і тэорыі прадстаўленняў, алгебраічных і тапалагічных груп пад старшынствам адпаведна С. І. Адзяна, А. І. Кастрыкіна, Д. К. Фадзеева, У. П. Платонава.

Удзельнікі сімпозіума на пленарных і секцыйных пасяджэннях абмяркуюць навейшыя дасягненні па тэорыі груп, абмяняюцца вопытам па метадах сучасных даследаванняў, магчымасцях прымянення матэматычнай навукі ў галіне прыродазнаўства.

Для ўдзельнікаў сімпозіума важную ролю адыграе асабісты абмен думкамі. Шмат карыснага для сябе атрымаюць маладыя вучоныя.

У дні сімпозіума госці Гомеля азнаёмяцца з яго выдатнымі мясцінамі.

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ



На гэтым тыдні споўнілася 50 гадоў дацэнту кафедры фізікі цвёрдага цела Арсенцію Пракопавічу Грыбайлу.

А. П. Грыбайла нарадзіўся на Магілёўшчыне ў сям'і служачых. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы тэхнікум і Гомельскі педінстытут імя В. П. Чкалава.

Працоўную дзейнасць А. П. Грыбайла пачаў у 1960 годзе настаўнікам фізікі і працоўнага навучання ў адной з сярэдніх школ г. Гомеля.

У 1960 г. ён паступіў у вочную аспірантуру Гомельскага педінстытута пры кафедры фізікі цвёрдага цела да навуковага кіраўніка вядомага ў нашай краіне і за рубяжом вучонага, прафесара Д. М. Гаркунова. Пасля заканчэння аспірантуры А. П. Грыбайла абараніў кандыдацкую дысертацыю і быў назначаны старшым навуковым супрацоўнікам навукова-даследчага сектара ГДУ.

У 1977 г. Арсенцій Пракопавіч быў выбран па конкурсу на пасаду ст. выкладчыка кафедры фізікі цвёрдага цела, а затым — дацэнта гэтай кафедры.

На працягу ўсёй вучобы ў аспірантуры і работы ў ГДУ А. П. Грыбайла прымаў актыўны ўдзел у выкананні гаспдагаворнай тэматыкі. Асноўным яго навуковым напрамкам з'яўляецца даследаванне фізіка-хімічных працэсаў трэння цвёрдых цел. Спіс яго публікацый налічвае звыш 70 навуковых работ, у тым ліку вучэбны дапаможнік, 8 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы.

Па выніках вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы А. П. Грыбайла неаднойчы ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі дэканата і рэктарата, знакамі «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва», «Ударнік камуністычнай працы».

Шмат энергіі і часу Арсенцій Пракопавіч удзяляе выкананню грамадскіх даручэнняў. Ён з'яўляецца членам парткома універсітэта, вучэбна-метадычнай камісіі ГДУ і фізічнага факультэта, намеснікам старшыні групы народнага кантролю фізфака, членам навукова-метадычнага савета Мінвуза СССР па практычнай падрыхтоўцы студэнтаў. Неаднойчы А. П. Грыбайла выбіраўся членам партбюро факультэта, старшынёй групы народнага кантролю.

За актыўную і шматгадовую работу ў органах народнага кантролю ён узнагароджаны Ганаровай граматай Гомельскага гарадскога камітэта народнага кантролю.

Калектыў фізічнага факультэта горача віншуе А. П. Грыбайлу з 50-годдзем з дня нараджэння і жадае яму моцнага здароўя, творчых поспехаў у працы.

**Т. ЖАЛОНКІНА,**
**сакратар партбюро фізічнага факультэта,**
**В. БАЛАКІН,**
**загадчык кафедры цвёрдага цела, прафесар.**

# ВЫРАСЦЕ НОВЫ КОРПУС



Паглядзеўшы на гэты здымак, чытач, напэўна, пачне ўспамінаць: дзе ён бачыў такі будынак? Але дарэмна напружваць памяць. Існуе ён пакуль што толькі ў праекце.

— Праект новага корпуса фізічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта індывідуальны, — расказвае яго галоўны архітэктар С. І. Пеўны з «Гомельграмадзянпраекта». — Сваёй архітэктурай ён дапоўніць цяперашні галоўны корпус, аўтарам якога таксама з'яўляюся я.

Праз тры гады цудоўны архітэктурны ансамбль упрыгожыць не толькі вуліцу Савецкую, але і горад наогул. Раздзеліць жа будынкі вуліца Цялегіна, у пачатку якой і размесціцца шасціпавярховы корпус.

Зроблены ён будзе з цэглы і аддзеланы дэкаратыўнай тынкоўкай. Уздоўж фізфака — вялікі аб'ядноўваючы ганак. Пасля першага паверху — арыгінальны «казырок» з трох бакоў. Над цэнтральным уваходам ён крыху даўжэйшы. Такі ж «паясок» і завершыць будынак, што толькі падкрэсліць большую выразнасць аб'екта, даўжыня якога дзевяноста, а шырыня — пяцьдзесят метраў. Агульная плошча — 15070 квадратных метраў. Акрамя галоўнага ўваходу, ёсць яшчэ тры.

...Першы паверх. Люстэркі. Прасторны вестыбюль і гардэроб. Крыху далей па калідору кухня. Побач буфет на 50 месц, дзе заўсёды можна будзе смачна і танна паснедаць перад заняткамі. Каб хутка падняцца на іншы паверх, прадугледжаны два ліфты, кожны з якіх разлічаны на дваццаць чалавек. Ёсць і лесвіцы.

Факультэцкая бібліятэка і чытальная зала размесцяцца на другім паверсе. Тут жа дэканат, кафедры, спецыяльныя лабараторыі, аўдыторыі рознага памеру і прызначэння. «Паточная» аўдыторыя разлічана, напрыклад, на 150 студэнтаў і нагадвае сабой трыбуну на стадыёне.

— Калідоры ў будынку асаблівыя, — гаворыць Сяргей Іосіфавіч. — Праз кожныя дваццаць пяць метраў — утульны хол. Мяккія крэслы, столік з кветкамі. Выдатнае месца, каб пасядзець з сябрам у перапынку паміж лекцыямі.

Шмат іншых спецыяльных памяшканняў і на астатніх паверхах. Размешчанае ў іх сучаснае абсталяванне дапаможа студэнтам спазнаць таямніцы цікавай прафесіі і замацаваць атрыманыя веды.

А пакуль што справа за будаўнікам трэста № 14, якім даручана ўзвесці гэты корпус. Падрыхтавана ўжо пляцоўка для гэтага аб'екта. Неўзабаве пачнуцца і асноўныя работы.

**С. БЯСПАЛЫ.**

# МІНУЛАЕ НАШАГА ГОРАДА

Гомель адносіцца да ліку тых гарадоў, дзе сляды мінулага можна знайсці толькі пасля спецыяльнага вывучэння. Але нягледзячы на гэта, у кожным з такіх гарадоў абавязкова ёсць месца пад назвай «стары горад».

...Гарадскі бюлетэнь-штогоднік «Весь Гомель», які выдаваўся да рэвалюцыі, а таксама звязаныя з ім кнігі «Гомель. Его прошлое и настоящее» (Масква, 1900). Л. Віняградава і «Горад Гомель» (Вільна, 1911) Ф. Жудро, І. Сербава, Д. Даўгяла даюць надзвычай цікавы матэрыял для краязнаўцаў, гісторыкаў, для ўсіх, хто цікавіцца мінулым горада.

Тэрыторыя славутага парка з'явілася геаграфічным цэнтрам ці менавіта тым «старым горадам», адкуль пачыналіся ўсе гомельскія вуліцы, куды абавязкова два разы ў тыдзень — у чацвер і нядзелю — накіроўваліся гамяльчане і госці горада для адпачынку. Любімым месцам для наведвальнікаў была пляцоўка ля цэнтральнай часткі палаца, дзе быў сапраўдны гай з трапічных дрэваў, ад якога вялі алеі з мармуровымі статуямі старажытных філосафаў, паэтаў, мастакоў, воінаў. Адсюль можна было спусціцца да дна яра, ці старажытнага рэчышча, ператворанага людзьмі ў азярцо прадаўгаватай формы. Тут знаходзілася яшчэ адно цікавае відовішча — «каменная баба»: стэпавая антрапаморфная стэла, якая нагадвала контуры жаночай фігуры. Яе прысутнасць стварала незвычайны гістарычны каларыт. Некалі па Сожы з даўніх часоў праплывалі шматлікія народы, а гандлёвыя лодкі заходзілі ў сучаснае «лебядзінае возера», як у сапраўдную гавань. На правым беразе яра стаяла калісьці драўлянае замчышча, а вакол яго — таксама драўляны пасад, у якім жылі першыя жыхары горада. Замчышча над стромай было любімым месцам чарнігаўскіх князёў, якім у XI—XII стагоддзях належыў Гомель.

Пазней славутасцю горада была Румянцаўская (цяпер Савецкая) вуліца. Першыя статыстычна-геаграфічныя апісанні Гомеля сведчаць, што гэтая вуліца была забудавана шматпавярховымі каменнымі дамамі, мела асфальтавыя і плітачныя тратуары.

Ад парка, з саборнай плошчы, да чыгуначнага вакзала пралягала другая вядомая вуліца — Замкавая (цяпер праспект імя Леніна), дзе жылі краўцы, шаўцы, цырульнікі, майстры гадзіннікаў і залатых спраў, уладальнікі гасцініц, гандлёвых лавак, аптэкары.

Да цэнтру належалі таксама Фельдмаршальская (цяпер Пралетарская), Магілёўская (імя Кірава), Кузнечная (Інтэрнацыянальная) і некаторыя меншыя вуліцы. Цікава, што аб былой назве Інтэрнацыянальнай вуліцы сведчыць сучасны Кузнечны мост.

Усе іншыя раёны лічыліся ўскраінамі. Паўночна-ўсходняя называлася «Каўказ» (у раёне сучаснага грузавога порта). На стромых адхонах раўкоў у невялічкіх зацінах жылі рыбакі, лодачнікі, рамеснікі. Да «Каўказа» прымыкала яшчэ адна ўскраіна — «Свісток» (у раёне цяперашняй Садовай вуліцы). Але ў адрозненне ад «Каўказа» гэтая частка горада была добра распланавана, забудавана: у ёй жылі чыноўнікі і афіцэры.

Паміж чыгункай, вакзалам і коннай плошчай (цяпер — рынак) размяшчалася «Амерыка» — сапраўдная «прамысловая рэспубліка», з кузнямі, ляснымі складамі, са шматлікім насельніцтвам.

Былі ў горадзе і іншыя ўскраіны, у тым ліку і былое дачнае месца гамяльчан — Беліца.

**У. БАГАМОЛЬНІКАЎ,**
**А. РОГАЛЕЎ,**
**выкладчыкі ГДУ.**

**ВУЧЭБНАЯ ПРАКТЫКА**

# НЕ МАРЫ, А НЕАБХОДНАСЦЬ

Перабудова сістэмы вышэйшай адукацыі датычыцца ўсіх: ад студэнта да міністра. Яна закранае ўвесь вучэбны працэс, у тым ліку і вучэбныя практыкі. Аб іх хацелася б сказаць асобна. Каб іх эфектыўнасць была высокай, неабходна думаць аб арганізацыі і правядзенні практыкі ў самым пачатку навучальнага года.

У вучэбным аддзеле універсітэта штогод абнаўляецца даволі ўнушальная табліца. У ёй пералічваюцца вучэбныя практыкі ўсіх факультэтаў, месцы іх правядзення і г. д. Проста дзіву даешся, як наш універсітэт з імі спраўляецца, тым больш, што яны праходзяць прыкладна ў адзін і той жа час.

У іх ліку — вучэбная практыка па гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі. Упершыню ў гісторыі геафака яна праводзілася ў чэрвені мінулага лета, працягвалася тры тыдні. Упершыню — гэта заўсёды складана, усё трэба арганізоўваць з нуля. Але гэта першая практыка прайшла ў цэлым здавальняюча. Дапамагла зладжаная работа ўсіх звенняў, пачынаючы ад кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі і заканчваючы вучэбным аддзелам ГДУ і прарэктарам па вучэбнай рабоце членам-карэспандэнтам АН БССР, прафесарам Л. А. Шамятковым. Своечасова была падрыхтавана ўся неабходная дакументацыя, выдзелены універсітэцкі аўтатранспарт з вадзіцелямі М. К. Ашытком і І. В. Дзямідавым, якія выдатна справіліся са сваімі абавязкамі, вывучаны патэнцыяльныя аб'екты і зроблен канчатковы выбар іх для праходжання практыкі. Вялікую арганізацыйную работу правяла адказная за практыкі Ю. Д. Алейнік.

Разам з усімі станоўчымі момантамі ў вучэбнай практыцы геолагаў былі і негатыўныя. Перш за ўсё, вучэбны палігон ў Чонках аснашчаны надзвычай слаба. Фактычна нечым было качаць ваду са свідравін. Вывад напрошваецца адзін: неабходна паскорыць набыццё абсталявання для палігона, не расцягваць гэты працэс на ўсю пяцігодку. І другое, бадай, галоўнае. У некаторых студэнтаў назіраецца слабая зацікаўленасць да абранай спецыяльнасці. Гэты факт пацвярджае своечасовасць мер, якія прымаюцца ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР па рэарганізацыі вучэбнага працэсу.

Якім хацелася б бачыць геалагічны палігон у Чонках летам наступнага года, калі практыка па гідрагеалогіі будзе праводзіцца там у другі раз? Уяўляецца такая карціна: прабураны 5 свідравін, змантыраваны электрычныя і віхравы насосы. Над імі абсталяваны павільён, побач з насосамі — перасоўчаны кампрэсар і буравы станок. З імі працуе вучэбны майстар. А на другім канцы палігона сканцэнтравана геафізічнае абсталяванне, яго рыхтуе да практыкі другі вучэбны майстар, геафізік.

Мары? Не, неабходнасць! І яе трэба рэалізоўваць, працягваючы ланцужок: кафедра — факультэт — універсітэт і вышэй.

**М. ЖУРАВЕЛЬ,**
**дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі.**

**СПОРТ**

# ПАСПЯХОВЫ ФІНІШ

Завяршылася чарговая круглагадовая спартакіяда студэнтаў рэспублікі. У апошніх відах праграмы паспяхова выступілі выхаванцы нашага універсітэта. Зноў высокае майстэрства прадэманстравала жаночая каманда па ручному мячу (трэнер **В. Крукоўскі**). Яна стала чэмпіёнам студэнцкага таварыства. Гонар зборнага калектыву абаранялі І. Навіцкая, А. Лучыновіч, Г. Казлова, А. Крывіцкая, А. Кузняцова, С. Серанкова, Н. Стрыжнёва, Л. Намаюнас, Н. Данілкіна з факультэта фізічнага выхавання, Н. Прысяжная з эканомфака, Н. Клімовіч, Л. Марозава і А. Дзігілёва з матфака.

Вышэйшыя ўзнагароды на спартакіядзе заваявалі і нашы футбалісты (трэнер **У. Джыоеў**). У камандзе выступалі А. Кончыц, І. Фралоў, В. Дзюбкін, А. Кобец, Ю. Чэкан, В. Петрык, А. Кавалёў з факультэта фізічнага выхавання, В. Поляк, В. Лапіцкі з эканомфака, А. Байко з гісфіла, С. Аксюцін з геалагічнага, В. Непша з фізічнага факультэта.

Другое каманднае месца заваявалі нашы весляры на байдарках і каноэ (трэнер **С. Сямёнаў**). Найбольшую колькасць заліковых ачкоў прынеслі студэнты факультэта фізвыхавання А. Байнякоў, С. Бондар, А. Прычыніч, С. Новік, Д. Кукса.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, кафедра хіміі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту гэтай кафедры ЛАПІЦКАЙ Святлане Канстанцінаўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

**Дэканат факультэта фізвыхавання і калектыў кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання выказваюць глыбокае спачуванне выкладчыцы кафедры РЫБАКОВАЙ Людміле Фёдараўне з выпадку напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

А323022

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 666